**Н. А. Гулак**

УДК 398(476)

Кафедра рэжысуры, факультэт мастацкай культуры, УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Рэспубліка Беларусь

# АСОБА І ДЗЕЙНАСЦЬ М. ГРЫНБЛАТА Ў КАНТЭКСЦЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

На значным фактaлагічным матэрыяле паказана дзейнасць беларускага савецкага фальклaрыста Майсея Грынблата, які ўнёс вялікі ўклад у збіранне і вывучэнне народнай творчасці. Прадстаўлены сацыяльна-палітычны і культурны кантэкст дзейнасці беларускіх акадэмічных вучоных у сярэдзіне XX ст.

**Ключавыя словы:** фальклaрыстыка, збіральніцкая дзейнасць, экспедыцыйныя матэрыялы, пашпартызацыя, культурны дыскурс.

**Узор цытавання:** Гулак, Н. А. Асоба і дзейнасць М. Грынблата ў кантэксце гісторыі беларускай савецкай фальклaрыстыкі / Н. А. Гулак // София: электрон. науч.-просветит. журн. – 2022. – № 2. – С. 9–14.

**N. Hulak**

Department of Artistic Culture, the Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Republic of Belarus

# M. GRINBLAT'S PERSONALITY AND WORK IN THE CONTEXT OF THE HISTORY OF BELARUSIAN SOVIET FOLKLORE STUDIES

Significant factual material shows the activities of the Belarusian Soviet folklorist Moysey Grinblat, who made a great contribution to the collection and study of folk art. The socio-political and cultural context of the activities of Belarusian scientists in the middle of the 20th century is presented.

**Keywords:** folklore, collecting activity, expeditionary materials, certification, cultural discourse.

**For citation:** Hulak N. M. Grinblat's personality and work in the context of the history of belarusian soviet folklore studies. *Sophia*. 2022;2;9–14. Belarusian.

**Аўтар:**

**Настасся Анатольеўна Гулак** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рэжысуры факультэта мастацкай культуры БДУКМ.

*hulaknasta@gmail.com*

**Author:**

**Nastassia Hulak** – PhD of Philology, Associate Professor of the Department of Artistic Culture, BSUCA.



Грунтоўнае асэнсаванне навуковай спадчыны аднаго з найбуйнейшых беларускіх савецкіх этнографаў – Майсея Якаўлевіча Грынблата (1905–1983) – у апошнія гады зроблена С. Захаркевічам. У яго артыкулах станаўленне і здабыткі М. Грынблата як этнографа паказаны ў шырокім сацыяльна-культурным кантэксце, па-сутнасці, рэканструяваны цэлы пласт гісторыі грамадска-культурнага жыцця і акадэмічнай навукі Беларусі сярэдзіны XX ст.

У дадзеным артыкуле прадстаўлены асобныя факты і ацэнкі, якія тычацца дзейнасці даследчыка ў галіне беларускай фалькларыстыкі.

Пры асэнсаванні ідэйных перакананняў М. Грынблата, асабліва даваеннага перыяду, прыходзім да высновы, што ён быў шчырым шукальнікам парасткаў новай эпохі ў народнай творчасці і, бясспрэчна, чалавекам сістэмы. Хаця, пагодзімся з С. Захаркевічам, сямейны асяродак і атмасфера тэарта У. Галубка садзейнічалі фарміраванню яго беларускасці [4, с. 510]. Бацька М. Грынблата быў знаёмы і падтрымліваў адносіны з выбітнымі дзеячамі беларускага Адраджэння. Многія беларускія газеты, якія выходзілі напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў першыя гады пасля яе, мелі пазнаку «Надрукавана ў друкарні Якава Грынблята. Менск». І. Цішчанка, які выдатна ведаў М. Грынблата асабіста ў гады працы ў Акадэміі навук, узгадваў, што да бацькі будучага вучонага часта заходзілі Янка Купала з жонкай, Змітрок Бядуля, Яўхім Карскі[1].

У 1930-я гг. савецкая ўлада, якая канструявала новую савецкую ідэнтычнасць, была зацікаўлена ва ўстаноўцы на фальклор, таму што для пабудовы гэтай ідэнтычнасці ідэалагема «народнасць» была выключна прадуктыўнай. Малады і перспектыўны даследчык М. Грынблат быў з таго пакалення навукоўцаў, літаратараў, дзеячаў культуры, якое ўспрыняло задачу пошуку, рэпрэзентацыі і сацыяльнай легітымізацыі ўзораў «новага сацыялістычнага народнага мастацтва».

У пачатку 1930-х гг. сектар этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР актыўна супрацоўнічаў з фальклорнай секцыяй АН СССР, якой кіраваў уплывовы тэарэтык новай фалькларыстыкі М. Азадоўскі. Этнамузыколагі Я. Гіпіус і З. Эвальд у 1932 і 1934 гг. ладзілі экспедыцыі ў Беларусь, у якіх браў удзел і М. Грынблат. Зафіксаваныя ў той час тэксты і напевы склалі ўнікальны зборнік «Песні беларускага народа», у якім пераважная большасць запісаў, зробленых на фанограф і на слых, былі надрукаваны ўпершыню.

Песням на савецкую тэматыку ў зборніку прысвечаны адзін з васьмі раздзелаў. Па-сутнасці, гэтыя тэксты («Агні бальшэвіцкіх ідэй», «Сталін, родны бацька наш», «Мы стаханаўцамі выйдам» і пад.) з’яўляюцца шаблоннымі формамі камунікацыі ў афіцыйным дыскурсе сталінскай эпохі. Як вынікае з каментарыяў, акрамя запісаў М. Грынблата, якіх найбольш, песні высокага ідэйнага гучання фіксавалі таксама З. Эвальд, Ф. Рубцоў, Н. Сакалоўскі, М. Равенскі, І. Сербаў. Сёння цяжка ацаніць ступень аўтаномнасці збіральнікаў і фактар вымушанай заангажаванасці тых, хто ўдзельнічаў у фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях Інстытута гісторыіі БССР. Аднак нельга пагадзіцца з ацэнкай А. Фядосіка, дадзенай у кнізе «Ілюзорнасць і сапраўднасць: “Белыя плямы” ў гісторыі фалькларыстыкі 20–30-х гадоў» (1991), які персаніфікаваў

[1] Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф. 457. Воп. 1. Спр. 95. Л. 1.

маштабныя крызісныя з'явы ў беларускай навуцы канца 1930-х гг., абвінавачваючы М. Грынблата. Даніну пошукам «новых з'яў» у фальклоры аддавалі многія, хто працаваў у гэты час. У фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва захоўваецца рукапіс укладзенага Р. Шырмай зборніка савецкага фальклору канца 1930-х гг. Тут ёсць матэрыялы самога Р. Шырмы, М. Калачынскага, Н. Сакалоўскага, У. Галубка, А. Слабадзецкага, А. Пялевіча, А. Пабядзінскага, М. Меяровіч. Вядомыя палітычныя падзеі, сярод якіх рэпрэсіі па справе «Саюза вызвалення Беларусі», абвастрылі працэс «вульгарызацыі і сацыялагізацыі дзейнасці па вывучэнні народнай творчасці» [2, с. 141], які выразіўся ў разнастайных формах кампрамісу між уладай і навуковай інтэлігенцыяй.

У 1936 г. пры Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР была арганізавана спецыяльная фальклорная камісія, нягледзячы на тое, што ў сістэме Інстытута гісторыі ўжо існавала адпаведнае падраздзяленне. Гэта рабілася на ўзор фальклорнай секцыі, заснаванай М. Горкім у саюзнай пісьменніцкай арганізацыі. Персанальны склад фальклорнай камісіі АН БССР з'яўляўся вельмі прадстаўнічым: старшыня – Якуб Колас, сярод сяброў – акадэмікі В. Шчарбакоў, М. Нікольскі, народны паэт Янка Купала, М. Лынькоў, А. Александровіч, І. Харык, М. Клімковіч і інш. [2, с. 145]. Тое, што яе вучоным сакратаром быў прызначаны М. Грынблат, указвала на яго моцныя пазіцыі ў акадэмічным асяродку. Паводле С. Захаркевіча, уся даваенная кар'ера М. Грынблата сведчыць аб палітычным даверы да яго [4, с. 514]. У сувязі з гэтым трэба адзначыць яшчэ той факт, што ў 1939 г. у Акадэміі навук БССР выйшаў укладзены М. Грынблатам і Л. Душманам зборнік твораў на ідыш пад назвай «Сталін у яўрэйскай народнай творчасці». Менавіта з вусна-паэтычнай творчасцю была звязана і педагагічная дзейнасць М. Грынблата да вайны. Паралельна з працай у Інстытуце гісторыі АН БССР ён выкладаў беларускі фальклор у Мінскім педагагічным інстытуце ў 1937–1941 гг. і ў БДУ на працягу 1939–1941 гг.[1]

У першыя пасляваенныя гады М. Грынблат увходзіў у невялікае кола даследчыкаў-энтузіястаў, дзеячаў культуры і службоўцаў (Л. Бараг, М. Мееровіч, Г. Цітовіч, Р. Шырма, Л. Мухарынская, І. Гутараў, Э. Галубок, М. Клімковіч), якія ў складаных умовах разбуранай народнай гаспадаркі, партыйна-дзяржаўнага кантролю займаліся збіраннем і вывучэннем фальклору. 22–26 красавіка 1945 г. на першай сесіі аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР М. Грынблат выступіў з дакладам аб вывучэнні народнай творчасці часоў вайны і аднаўленні даваеннай сеткі карэспандэнтаў сектара этнаграфіі і фальклору.

Важную сацыяльна-ідэалагічную нагрузку выконвалі беларускія вучоныя на мерапрыемствах усесаюзнага ўзроўню. У чэрвені 1946 г. у Маскве М. Грынблат разам з Г. Цітовічам прадстаўлялі навуку БССР на канферэнцыі па беларускім і ўкраінскім фальклоры. У снежні 1947 г. М. Грынблат разам з І. Гутаравым, Л. Барагам, Г. Цітовічам удзельнічаў ва Усесаюзнай нарадзе ў Інстытуце этнаграфіі АН СССР па цэнтральнай праблеме тагачаснай фалькларыстыкі – вывучэнні народнай творчасці часоў Вялікай Айчыннай вайны.

У гэты час, як вядома, сектар этнаграфіі і фальклору аднавіў палявую працу. Часопіс «Весці АН БССР» (1947, № 1) паведамляе, што ў 1945–1946 гг. экспедыцыі пад кіраўніцтвам М. Грынблата абследавалі раёны Цэнтральнай Беларусі і Заходняга Палесся, дзе сабралі вельмі каштоўныя матэрыялы. Напрыклад, у экспедыцыі 9–15 чэрвеня

1 БДАМЛМ. Ф. 55. Воп. 1. Спр. 68. Л. 2.

1945 г. у Гродна, Ліду, Навагрудак і Баранавічы даследчык зафіксаваў 40 твораў[1]. Аналіз семантыкі і жанравай прыроды гэтых вельмі цікавых тэкстаў паказвае заканамернасці, якія могуць быць экстрапаляваны на ўвесь масіў народнай песні часоў вайны і служыць гіпотэзай для далейшых даследаванняў.

Ідэалагічныя кампаніі 1945–1953 гг. пад кіраўніцтвам А. Жданава і адпаведныя Пастановы істотна паўплывалі на акадэмічную навуку савецкай краіны. Атрымалася так, што падрыхтаваны М. Грынблатам зборнік «Матэрыялы па фальклору Вялікай Айчыннай вайны» быў прадстаўлены да друку якраз падчас нарастання ў БССР барацьбы з «бязроднымі касмапалітамі». Зборнік, у які ўвайшлі экспедыцыйныя матэрыялы першых пасляваенных гадоў, падпаў вострай крытыцы з пазіцый ідэалогіі. Сярод рэцэнзентаў, якія выказвалі крытыку, быў, напрыклад, М. Лынькоў[2]. У 1951 г. цэнтральная газета «Праўда» змяшчае разгромны па тых часах матэрыял «Аб рабоце выдавецтва Беларускай Акадэміі навук» з крытыкай кіраўніцтва Інстытута гісторыі, якое недаацэньвае цэнзарскую ролю выдавецтва і безадказна ставіцца да публікацыі навуковых прац. Гаворка ідзе пра кнігу «Материалы по фольклору Великой Отечественной войны»[3]: «Неразборлівы ўкладальнік М. Я. Грынблат уключыў у яе ўсё, што трапілася яму пад руку. У выніку пад выглядам фальклору ў рукапісу былі прадстаўлены творы, якія не маюць нічога агульнага з народнай творчасцю, вульгарызуюць яе, культывуючы непісьменнасць» [5, с. 3].

М. Грынблата абвінавачвалі ў сур'ёзных недахопах, выяўленых у сігнальным экзэмпляры першага тома «Беларускае народнае мастацтва», прысвечанага народнаму тэкстылю. Сёння гэтае выданне выглядае змястоўным і навукова вывераным[4]. Яно пачынаецца інфарматыўным этнаграфічным нарысам, у якім аўтар сярод іншага піша пра слуцкія паясы як выдатную з'яву XVIII ст., тут згадана пра заснаваную Радзівілам у 1758 г. «персіярню» ў Слуцку, шоўкаткацтва фабрыкі каля Гродна, у Ружанах, Нясвіжы. Каляровыя ілюстрацыі ў кнізе суправаджаюцца анатацыямі і інш. З дакладной запіскі вучонага сакратара Прэзідыума АН БССР Э. М. Пазняка вынікае, што ў дакор М. Грынблату ставілася наступнае: «У прадмове ні слова не гаворыцца аб паспяховым перавыкананні пасляваеннай Сталінскай пяцігодкі, пра вялікія Сталінскія будоўлі камунізму, якія натхняюць увесь савецкі народ на працоўныя подзвігі <…> Грынблат не здолеў паказаць, што новага ўнесена ў беларускае народнае мастацтва ў савецкую эпоху. У ілжывым святле ім прадстаўлены побыт калгаснага сялянства Беларусі. Ад артыкула М. Я. Грынблата патыхае даўнінай і адсталасцю»[5].

У гэты драматычны час М. Грынблата падтрымаў А. Залескі – гісторык, удзельнік вайны, будучы намеснік дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ) [3, с. 90]. У красавіку 1952 г. Прэзідыум зняў М. Грынблата з пасады загадчыка

[1] Песні гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Запісы М. Я. Грынблата. Гродна, Ліда, Навагрудак, Баранавічы. Гл.: Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ). Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1366. Л. 1–62.

[2] ЦНБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1948. Л. 1–2.

[3] Кніга не выйшла. Рукапіс захоўваецца ў БДАМЛМ (Ф. 79. Воп. 1. Спр. 31. Л. 1–170). Асобныя матэрыялы ўключаны ў акадэмічныя выданні «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны» (1961), «Песні савецкага часу» (1970).

[4] Беларускае народнае мастацтва [Выяўленчы матэрыял]: [альбом] / АН БССР, Ін-т гісторыі, Секцыя этнаграфіі і фальклору. Т. 1: Ткацтва. Каўрадзелле. Вышыванне. Вязанне. Набойка. Мінск: Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1951. 103 с. (Выйшла абмежаваным накладам).

[5] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п. Воп. 73. Спр. 39. Л. 7–8.

сектара этнаграфіі і народнай творчасці і перавёў на пасаду старшага навуковага супрацоўніка[1]. У наступныя гады сваёй працы ў АН БССР М. Грынблат актыўна займаўся экспедыцыйнай дзейнасцю. Звесткі пра экспедыцыі ІМЭФ у розныя рэгіёны Беларусі перыядычна з'яўляліся на старонках газеты «Літаратура і мастацтва».

У 1957 г. на базе сектара этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі і сектара мастацтва Інстытута літаратуры быў створаны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, які паступова робіцца навуковым цэнтрам у справе збірання і публікацыі фальклорных матэрыялаў. У красавіку 1960 г. М. Грынблат як адзін з самых вопытных «палявікоў» бярэ ўдзел у Рэспубліканскай нарадзе па пытаннях каардынацыі збірання і даследавання беларускага фальклору. Яго даклад аб стратэгічных задачах збіральніцкай дзейнасці вызначаецца дакладнасцю даследчыка-практыка. Сярод іншага ён указвае, што план экспедыцыйных работ фалькларыстаў па кожнай вобласці павінен улічваць узровень абследаванасці раёна, «кусты» суседніх раёнаў, якія характарызуюцца агульнасцю паасобных з'яў абрадавай культуры і выканальніцкага стылю, межы абласцей і раёнаў БССР суадносна з межамі былых паветаў і губерняў і інш. [1, с. 37–38].

Ідэйна-тэарэтычныя падыходы і ацэнкі М. Грынблата адносна тэкстаў, за якімі замацавалася назва «савецкі фальклор», не змяніліся, за выключэннем «перафарматавання» ў святле рашэнняў XXII з'езда КПСС адносна культу асобы, аб чым гаворыць яго публікацыя прыказак з «даваенных і пасляваенных запісаў з розных раёнаў БССР» у кнізе «Праблемы сучаснага беларускага фальклору» (1969). Матэрыял М. Грынблата выглядае рэліктам нават сярод іншых, вывераных у ідэйным сэнсе матэрыялаў. Гэта сведчыць пра адыход даследчыка ад навуковай рэфлексіі і падмену яе канстатацыяй фактаў «сучаснай народнай масавай мастацкай самадзейнасці»: *Колас да коласа – Радзіме сноп; Слаўна хата не вугламі, а працаднямі; Без ленінскіх запаветаў не было б улады Саветаў; Калісьці мігцела свяча – цяперззяе лямпачка Ільіча* і інш. [6, с. 158; 162].

Аднак М. Грынблат здолеў увасобіць свой магутны даследчыцкі патэнцыял у працы, якая не датычылася ўласна тэорыі і метадалогіі фалькларыстыкі і этнаграфіі, але па-сутнасці сваёй служыла і служыць значным унёскам у народазнаўства Беларусі XX ст. Гэта «Беларуская этнаграфія і фалькларыстыка: бібліяграфічны паказальнік (1945–1970)» (1972). Акрамя вялізнай колькасці асноўных прац, тут улічаны даследаванні з сумежных галін ведаў (археалогіі, гісторыі, антрапалогіі, дэмаграфіі, мовазнаўства і інш.), якія маюць дачыненне да праблем этнаграфіі і фалькларыстыкі. Паказальнік, які ахоплівае вельмі важны перыяд развіцця беларускай навукі, сімвалізуе пачэсны ўнёсак у яе вучонага, грамадзяніна сваёй краіны і чалавека сваёй эпохі.

[1] У 1981 г. у аўтабіяграфіі М. Грынблат указвае, што гэта адбылося ў ліпені 1952 г.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. *Грынблат, М. Я.* Аб планаванні работы па збіранню беларускага фальклору ў гады сямігодкі / М. Я. Грынблат // Інструктыўныя і метадычныя матэрыялы па збіранню і вывучэнню беларускага фальклору / пад рэд. С. К. Майхровіча. – Мінск: Выд.-ва АН БССР, 1961. – С. 32–40.

2. *Гужалоўскі, А. А.* Пачатак канструявання сталінскага фальклору ў БССР (1934–1935 гг.) / А. А. Гужалоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: [зб. арт.] / НАН Беларусі, ЦДБКМЛ, філіял ІМЭФ імя Кандрата Крапівы. – 2018. – Вып. 25. – С. 141–146.

3. *Захаркевіч, С.* Барацьба за заходнія этнаграфічныя граніцы Беларусі: дзейнасць беларускага савецкага этнографа М. Я. Грынблата падчас Другой сусветнай вайны / С. Захаркевіч // Традиции университета: от Франциска Скорины до современности: сб. матер. Междунар. науч. конф. (Минск, 26–27 окт. 2017 г.) / ред.: С. Н. Ходин [и др.]. – Мінск: Изд. центр БГУ, 2017. – С. 88–97.

4. *Захаркевіч, С.* Як гартавалася сталь: станаўленне беларускага савецкага этнолага Маісея Якаўлевіча Грынблата / С. Захаркевіч // Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні: зб. навук. прац. – Вып. 3 / рэд. Т. В. Лапцёнак. – Мінск: Белар. навука, 2016. – С. 505–518.

5. *Зинькович, И.* О работе издательства Белорусской Академии наук / И. Зинькович // Правда. – 18 декабря 1951. – С. 3.

6. Праблемы сучаснага беларускага фальклору / Акадэмія навук БССР, Ін-т мастацтвазн., этнагр. і фалькл. / рэд.: П. Ф. Глебка, М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 168 с.